**УДК [94(476):35.076+37+792.03]«1864/1914»**

# ДЗЕЙНАСЦЬ ГУБЕРНАТАРАЎ У СФЕРЫ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У 1864 – 1914 гг.

*Я.М. ЛЯПЕШКІН*
*(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)*

*У артыкуле паказана дзейнасць губернатараў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў у сферы развіцця адукацыі, тэатра і навуковых даследаванняў на працягу* 1864–1914 гг. *Прыведзены ацэнкі, прапановы, перапіска губернатараў па адпаведных пытаннях і вынікі гэтых дзеянняў. Адлюстроўваюцца матывы і дасягненні дзейнасці: станоўчыя і адмоўныя бакі. Адзначаецца, што начальнікі губерняў не толькі рэалізоўвалі распараджэнні вышэйшага кіраўніцтва, але і самі прымалі рашэнні, якія ўплывалі на культурнае развіццё губерні. Разам з тым губернатарскія ініцыятывы нярэдка замаруджваліся ці ўвогуле адмаўляліся з боку вышэйшага начальства па фінансавых ці іншых прычынах. Губернатары садзейнічалі падняццю культурна-адукацыйнага ўзроўню насельніцтва беларускіх губерняў, але без уліку яго этна-лінгвістычных асаблівасцяў – у рамках палітыкі русіфікацыі.*

***Ключавыя словы:*** *беларускія губерні, губернатары, адукацыя, культурнае развіццё, тэатр, навука, русіфікацыя.*

**Уводзіны.** У айчыннай гістарыяграфіі дзейнасць грамадзянскіх начальнікаў беларускіх губерняў мала даследавана. У асноўным яна прадстаўлена нешматлікімі артыкуламі [1; 2]. У больш маштабных працах, прысвечаных губернатарам, аўтары факусіруюцца на біяграфіях [3; 4]. Выключэннем з'яўляецца манаграфія П.І. Брыгадзіна і А.М. Лукашэвіча прысвечаная грамадзянскім і вайсковым кіраўнікам Мінскай губерні [5]. Замежныя даследчыкі ўвогуле не разглядалі гэтае пытанне. Вывучалася толькі дзейнасць асобных губернатараў, альбо разглядаліся іх мерапрыемствы ў межах адной з беларускіх губерняў. Дзейнасць начальнікаў усіх беларускіх губерняў цалкам не аналізавалася.

Мэта артыкула – праз дзейнасць губернатараў раскрыць уплыў, які яны аказалі на фарміраванне культуры і адукацыі ў беларускіх губернях у 1864 – 1914 гг.

**Асноўная частка.** Згодна "Агульнаму губернскаму ўстанаўленню" Звода законаў Расійскай імперыі 1857 г. губернатары прызначаліся і звальняліся манархам [6, с. 61], але былі падведамасны Міністэрству ўнутраных спраў (далей – МУС) [7, с. 95]. Адначасова яны падпарадкоўваліся генерал-губернатару на той тэрыторыі, дзе існаваў гэты орган улады [6, с. 157].

"Агульны наказ грамадзянскім губернатарам" ад 3 чэрвеня 1837 г. кваліфікаваў губернатараў як начальнікаў губерняў, што павінны былі сачыць за выкананнем законаў, абавязваліся захоўваць грамадскі спакой, бяспеку, здаровы стан насельніцтва; забяспечваць харчаваннем губерню, аказваць бездапаможным апеку; ажыццяўляць нагляд за правасуддзем, выкананнем законных пастаноў і патрабаванняў; садзейнічаць умацаванню народнага дабрабыту [8, с. 362]. Губернатары таксама павінны былі назіраць за выпускнікамі вышэйшых навучальных устаноў, якія накіроўваліся на дзяржаўную службу [8, с. 365]. У іх кампетэнцыі знаходзіўся нагляд за тым, каб не распаўсюджвалася друкаваная прадукцыя, якая не мела адабрэння цэнзуры ці была забаронена ўрадам [6, с. 82].

Уплыў начальнікаў губерняў на справу школьніцтва з 1866 г. узрос. Яны надзяляліся правам прызначэння членаў вучылішчных саветаў ад МУС [9, арк. 2].

Сваю дзейнасць губернатары ажыццяўлялі праз губернскае праўленне, у якім яны старшынствавалі, а таксама – праз прыказы і камісіі [8, с. 362]. Начальнікі губерняў абавязкова з'яўляліся старшынямі ў наступных установах: прыказе грамадскай апекі, камісіі народнага харчавання, будаўнічай і дарожнай камісіі, воспенным камітэце, губернскім камітэце грамадскага здароўя, аддзяленні камерцыйнага савета і мануфактурным камітэце, камітэце аб конназаводстве, рэкруцкім камітэце, камітэце земскіх павіннасцяў і адмысловай аб гэтых павіннасцях прысутнасці, статыстычным камітэце, турэмным камітэце. Справаводствам займалася канцылярыя губернатара [6, с. 61–62, 163–165].

Мадэрнізацыйныя працэсы, якія ахапілі Расійскую імперыю з 1860-х гг., выклікалі паскоранае развіццё эканомікі, што ў сваю чаргу прыводзіла да сацыяльных змен. Павялічвалася патрэбнасць у кваліфікаваных кадрах. Адбываўся рост адукацыйнага ўзроўню насельніцтва.

Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. у беларускіх губернях пачала актыўна разгортвацца шырокая сетка дзяржаўных пачатковых навучальных устаноў на рускай мове. Яны павінны былі канчаткова выцісньць польскае навучанне. У Беларусі развіццё асветы спалучалася з русіфікатарскімі задачамі імперскіх улад.

Як адзначае даследчыца нацыянальнай педагогікі С.В. Снапкоўская, негатыўныя наступствы русіфікатарскіх мерапрыемстваў для Беларусі выявіліся ў наступным: “пазбаўленні права на адкрыццё вышэйшых навучальных устаноў, забароне ўжывання ў школе беларускай і польскай моў, фактычнай забароне беларускамоўнага друку, якая існавала аж да рэвалюцыі 1905–1907 гг.” [10, с. 11]. Пад уплывам рэвалюцыйных падзей улады пайшлі на скасаванне многіх абмежаванняў ва ўжыванні нацыянальных моў. З’явіліся выдавецтвы і легальны друк на роднай мове. Але навучанне на беларускай мове засталося пад забаронай [10, с. 33, 42].

Актыўную ролю ў рэалізацыі адукацыйнай палітыкі ўрада на мясцовым узроўні адыгралі губернатары. На гэта ўказваюць дакументы ў галіне народнай асветы.

У справаздачы па кіраванні народнымі вучылішчамі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях за 1865 г. згадваецца пра мужчынскае і жаночае вучылішчы ў заснаваным рускім паселішчы Царская слабада Рагачоўскага павета. Адзначаецца, што, на думку начальніка Магілёўскай губерні, яны былі адкрыты з тым, каб “спрыяць дасягненню палітычнай мэты; з якою ўладкавана пазначанае паселішча, г.зн. абрусенню мясцовасці шляхам адукацыі маладога пакалення” [11, арк. 7, 8 зв.].

Губернатары былі зацікаўлены і ў развіцці медыцынскай адукацыі. Так, начальнік Магілёўскай губерні А.П. Беклемішаў (1857–1868) у 1863 г. даручыў распрацаваць праект радзільнага інстытута і павівальнай школы. У 1864 г. праект быў зацверджаны, і статуты дзвюх устаноў апублікаваны. У пачатку 1865 г. павівальная школа была адкрыта [12, с. 961].

Магілёўская губернская адміністрацыя для паляпшэння сельскай медыцыны прапанавала ператварыць павівальную школу ў цэнтральную для Магілёўскай, Мінскай і Віцебскай губерняў. Гэта ідэя была адобрана імператарам. У 1875 г. яна была рэалізавана [12, с. 962].

Безумоўна, начальнікі губерняў спрыялі павышэнню адукацыйнага ўзроўню грамадства. У гэтым аспекце найбольшую актыўнасць праяўлялі віцебскі губернатар П.Я. Растоўцаў (1869–1880) і магілёўскі – А.С. Дамбавецкі (1872–1893).

Так, Суражская гарадская дума па прапанове П.Я. Растоўцава вырашыла за кошт гараджан набыць будынак для народнага вучылішча. Дзякуючы намаганням губернатара 3-класная Віцебская жаночая гімназія была ператворана ў 7-класную. У 1872 г. па прапанове П.Я. Растоўцава ў Полацку была адкрыта настаўніцкая семінарыя. Пасля адкрыцця чарговай бясплатнай школы для дзяцей бедных жыхароў Віцебска, губернатар звяртаўся ў Дырэкцыю віцебскіх народных вучылішчаў з просьбай забяспечыць навучэнцаў неабходнымі рэчамі [1, с. 183–184].

У 1860 – 1914 гг. у Беларусі дзейнічалі розныя віды афіцыйных навучальных устаноў на рускай мове. У сельскай мясцовасці пачатковая адукацыя была прадстаўлена народнымі вучылішчамі, царкоўнапрыходскімі школамі і школамі граматы, а ў гарадах – прыходскімі павятовымі і гарадскімі вучылішчамі. У некаторых гарадах Беларусі функцыянавалі гімназіі і прагімназіі, рэальныя вучылішчы, якія давалі сярэднюю адукацыю [13, с. 278].

Усяго на 1874 г. у беларускіх губернях было 6 гімназій, 5 прагімназій, 4 рэальных вучылішчы [14, с. III]. Пачатак XX ст. характарызаваўся больш паскораным з’яўленнем новых сярэдніх навучальных устаноў. Так, колькасць урадавых гімназій у 1915 г. склала 54, а прыватных і грамадскіх гімназій налічвалася 27 [15, с. 19].

Будучых педагогаў пачатковых школ рыхтавалі ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах – настаўніцкіх семінарыях. Да канца XIX ст. у Беларусі іх было 4: у Маладзечне (заснавана ў 1864 г.), Полацку (1872), Нясвіжы (1874) і Свіслачы (1875) [16, с. 100, 104, 105, 107].

Падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў для школы адбывалася ў настаўніцкіх інстытутах. У пачатку XX ст. яны былі адкрыты ў наступных беларускіх гарадах: Віцебску (1910), Магілёве (1913) і Мінску (1914) [17, с. 385].

Вышэйшыя навучальныя ўстановы на беларускіх землях пасля скасавання тут Горы-Горацкага земляробчага інстытута ў 1864 г. да канца існавання Расійскай імперыі так і не з’явіліся. Улады не спяшаліся з іх адкрыццём [10, с. 19].

Аднак адносіны начальнікаў беларускіх губерняў да стварэння мясцовых устаноў вышэйшай адукацыі не былі адназначна адмоўнымі. Так, мінскі губернатар А.Ф. Гірс (1912 – 1915) бачыў патрэбу для Мінскай губерні ў сельскагаспадарчым інстытуце. На яго думку гэта ўстанова паслужыла б падняццю дабрабыту вёскі, прыцягнула б “рускіх культурных людзей” у мясцовы край. Між тым А.Ф. Гірс адмоўна ставіўся да хадайніцтва Мінскай лясной біржы аб адкрыцці ў Мінску камерцыйнага інстытута. Ён лічыў, што такая ўстанова “будзе абслугоўваць выключна асоб іўдзейскага паходжання”, павялічыць прыток яўрэяў з іншых губерняў і ў выніку пасадзейнічае ўзмацненню тут “варожага існуючаму ладу іншароднага элемента”. Таму мінскі губернатар з ухваленнем адгукаўся міністру ўнутраных спраў пра абмеркаванне адкрыцця сельскагаспадарчага інстытута ў Губернскім земскім сходзе Мінскай губерні [18, арк. 1–2 зв.; 5, с. 309–310].

19 ліпеня 1913 г. МУС паведаміла мінскаму губернатару, што прадстаўленае ім хадайніцтва Мінскай лясной біржы аб адкрыцці камерцыйнага інстытута ў Мінску Міністэрства гандлю і прамысловасці адхіліла [18, арк. 6–6 зв.].

Як паказаў прыклад з А.Ф. Гірсам, некаторыя губернатары былі не супраць стварэння на тэрыторыі Беларусі ўстаноў для падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Але з улікам мясцовых умоў перавага аддавалася пэўнаму профілю.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі адбывалася павелічэнне ліку навучальных устаноў і навучэнцаў, пераважна за кошт пачатковай адукацыі.

Так, у 1865 – 1868 гг. у Віленскай губерні налічвалася 62 пачатковыя школы з 2411 навучэнцамі, у Віцебскай – 91 школа з 2301 навучэнцамі, у Гродзенскай – адпаведна 76 з 4363, у Мінскай – 560 з 11589, у Магілёўскай –360 з 6130. Амаль за паўстагоддзя становішча істотна змянілася. У 1911 г. у Віленскай губерні пачатковых школ налічвалася 1114 з 43798 хлопчыкамі і 18346 дзяўчынкамі, у Віцебскай – 1524 школ з 51191 хлопчыкамі і 24511 дзяўчынкамі, у Гродзенскай – 1575 з 65777 і 26450, у Мінскай – 2086 з 88688 і 28024, у Магілёўскай – 2085 з 93076 і 33469 [19, с. 2, 6–7].

Відавочна, расійскія ўлады, у тым ліку губернатары, у адукацыйнай палітыцы на беларускіх землях рабілі стаўку на пачатковую школу, у меншай ступені – на сярэднюю. Спробы стварэння вышэйшых навучальных устаноў, падтрыманыя з боку губернатараў, рабіліся, але да канца існавання імперыі так і не ажыццявіліся.

Міністэрства народнай асветы (далей – МНА) пры вырашэнні пэўных пытанняў звярталася да МУС, якое ў сваю чаргу высвятляла меркаванні па адпаведных прадметах у губернатара. У 1886 г. МНА звярнулася да МУС з прапановай утрымання прыходскіх вучылішч за кошт гарадоў. МУС накіравала запрос губернатарам, у тым ліку віцебскаму, з тым, каб даведацца аб іх меркаванні [20, арк. 1–1 зв.].

У прыходскіх гарадскіх вучылішчах навучаліся ў асноўным дзеці беднага хрысціянскага насельніцтва. Таму 29 красавіка 1887 г. у адказ на запыт Гаспадарчага дэпартамента МУС віцебскі губернатар В.М. Далгарукаў (1884 – 1894) прапанаваў аднесці ўтрыманне прыходскіх вучылішч да ліку абавязковых гарадскіх выдаткаў. З 1891 г. органы гарадскога самакіравання заканадаўча абавязваліся несці выдаткі на ўтрыманне прыходскіх вучылішч [21, с. 87; 20, арк. 47–48].

16 мая 1895 г. у Камітэце міністраў слухалі запіску віцебскага губернатара У.А. Левашова (1894–1899) аб першым аб’ездзе губерні. Паведамлялася, што царкоўна-прыходскія школы і вучылішчы МНА складалі “галоўную аснову насаджэння ў народзе пісьменнасці”. Але, на думку губернатара, “іх яшчэ мала і асабліва рэдкія яны там, дзе мала цэркваў” [22, с. 21, 23].

У 1880 г. губернатар А.С. Дамбавецкі звярнуўся да міністра ўнутраных спраў і народнай асветы з просьбай аб дазволе адкрыць у Магілёве рэальнае вучылішча пад найменнем “Аляксандраўскае”. Прапанову падтрымаў імператар [12, с. 920]. 1 ліпеня 1885 г. вучылішча было адкрыта ў спецыяльна створаным будынку на ахвяраванні жыхароў губерні [23, с. 15].

Распаўсюджванне пачатковай адукацыі сярод шырокіх сялянскіх колаў у значнай ступені залежыла ад начальнікаў губерняў. Так, у 1883 г. да магілёўскага губернатара А.С. Дамбавецкага звяртаўся магілёўскі епіскап з просьбай садзейнічаць заснаванню царкоўна-прыходскіх школ пры ўсіх цэрквах Магілёўскай губерні. Губернатар спачуваў гэтай справе. У сувязі з чым 15 лютага 1883 г. ён выдаў цыркуляр павятовым спраўнікам і неадменным членам павятовых па сялянскіх справах прысутнасцяў Магілёўскай губерні з мэтаю пашырэння царкоўна-прыходскага навучання. “Растлумачваць сялянам сапраўднае значэнне гэтых школ, – адзначалася ў дакуменце, – іх важнасць у сэнсе самой пачатковай рэлігійна-маральнай адукацыі, нарэшце карысць і параўнальную таннасць, каб узбудзіць жаданае спачуванне ў сялянскім насельніцтве” [24, арк. 9]. Як адзначае беларускі гісторык Б.І. Сідарэнка, у пачатку 90-х гг. XIX ст. Магілёўская губерня па ахопу сялянскіх дзяцей царкоўна-прыходскім навучаннем займала трэцяе месца ў Расійскай дзяржаве пасля Кіеўскай і Падольскай губерняў [25, с. 152]. І ў гэтым несумненна бачыцца заслуга А.С. Дамбавецкага.

Хаця беларуская даследчыца С.В. Снапкоўская ўказвае на неэфектыўнасць гэтага віду навучання. “Царква лічыла галоўнай задачай школы рэлігійнае і вернападданніцкае выхаванне, а не ўзбраенне ведамі”, – зрабіла яна выснаву [10, с. 15–16]. З гэтым сцверджаннем можна пагадзіцца. Але з’яўленне нават царкоўна-прыходскай школы ў сельскай мясцовасці было лепш, чым ніякай. Адсутнасць хоць якой-небудзь легальнай навучальнай установы магла стаць прычынай узнікнення тайнай школы. Асабліва гэта праявілася ў пачатку XX ст., калі сяляне з большай прыхільнасцю пачалі ставіцца да набыцця пісьменнасці сваімі дзецьмі.

Разам з падняццем адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, губернатары актыўна праводзілі на месцы ўрадавую палітыку русіфікацыі. Як заўважае расійскі гісторык Б.М. Міронаў, важнейшым інструментам русіфікацыі разглядалася адукацыя на рускай мове [26, с. 181]. Таму беларускія сяляне павінны былі асвойваць элементарныя веды праз рускую культуру і, што не менш важна, у вернападданніцкім духу і з прыхільнасцю да праваслаўя. Напрыклад, віленскі губернатар С.Ф. Панюцін (1863 – 1868) дбаў аб навучанні ў народных школах рускай мове [27, с. 294]. Другі віленскі губернатар М.А. Грэвеніц (1885 – 1895) у справаздачы імператару за 1885 г. прапаноўваў увесці больш жорсткае пакаранне за тайныя польскія школы. І гэта невыпадкова, паколькі ён прытрымліваўся наступнага меркавання: “толькі шляхам правільнага выхавання ў рускім духу і напрамку пакаленняў, якія сталеюць, могуць быць сцёртыя сляды працяг-

лага польска-кататаліцкага ўплыву і панавання ў тутэйшым краі, якое ўскладняе цяпер поўнае зліццё мясцовага насельніцтва з астатняй Расіяй” [28, арк. 12].

Тайнае польскае навучанне на беларускіх землях з пераважна каталіцкім насельнітвам з’явілася пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. Аб гэтым сведчаць расійскія рапарты, якія паведамлялі аб выкрыцці законспіраваных школ, дзе вучылі чытаць і пісаць па-польску [29, s. 284]. У 1871 – 1878 гг. у Віленскай навучальнай акрузе выкрылі 194 нелегальныя школы: 149 польскіх, 19 расійскіх, 14 літоўскіх, 12 яўрэйскіх [29, s. 295]. З’яўленне нават расійскага тайнага навучання было выклікана недастатковай колькасцю легальных устаноў. Наяўнасць тайнага навучання, галоўным чынам польскага, можна растлумачыць нежаданнем расійскіх улад дапускаць існаванне нацыянальных школ, якія супярэчылі русіфікатарскай палітыцы ўніфікацыі. У пачатку XX ст. сярод вясковага праваслаўнага насельніцтва Беларусі з-за недахопу казённых устаноў былі распаўсюджаны расійска-беларускія тайныя школы, у якіх навучанне вялося як на рускай так і беларускай мовах [17, c. 350–351]. Для заснавальнікаў тайных школ і тых хто садзейнічаў іх стварэнню згодна “Часовых правілаў” 1892 г. прадугледжвалася пакаранне ў выглядзе арышта ці штрафа [10, c. 48–49].

У беларускіх губернях існавала яўрэйская адукацыя. Яна была прадстаўлена канфесійнымі іўдзейскімі школамі (хедэрамі, талмуд-торамі, іешывамі), рускамоўнымі казённымі яўрэйскімі вучылішчамі, прыватнымі гімназіямі для яўрэяў і інш. Існаваў Віленскі яўрэйскі настаўніцкі інстытут [15, c. 35–36; 16, c. 97]. Акрамя таго яны маглі навучацца ў агульнаадукацыйных установах. Для абрусення яўрэяў гродзенскі губернатар А.М. Пацёмкін (1883 – 1890) прапаноўваў “павялічыць колькасць правільна арганізаваных пачатковых школ рускай пісьменнасці, з выкладаннем у іх для яўрэяў законаў веры па-яўрэйску”. Імператар даручыў вывучыць гэта пытанне міністру народнай асветы [30, арк. 51 зв.–52]. Міністр тлумачыў, што колькасць пачатковых школ у губерні па меры сродкаў павялічваецца, а прапанову губернатара разглядаць рана, бо ў гэты час адбываўся перагляд пастаноў аб яўрэях [31, c. 191].

Гродзенскі губернатар М. П. Урусаў (1901 – 1902) у справаздачы за 1901 г. галоўным сродкам па абрусенню края называў школу [32, арк. 6]. Такім чынам, начальнікі губерняў паўсюдна садзейнічалі адкрыццю дзяржаўных (расійскіх) устаноў адукацыі. Так, у 1902 г. у Гродна, па ініцыятыве губернатара П.А. Сталыпіна (1902 – 1903) былі адкрыты яўрэйскае двухкласнае народнае і рамеснае, а таксама жаночае прыходскае з трэцім прафесійным класам вучылішчы [3, c. 114].

***Культура***. У сферы развіцця культуры беларускіх губерняў 60-х гг. XIX – пачатку XX ст. таксама назіраўся актыўны ўдзел губернатараў. Але ён, ізноў жа, спалучаўся з русіфікатарскімі намерамі Сакнт-Пецярбурга. Беларускія землі павінны былі паказвацца толькі як спрадвечная частка Расіі, а беларусы – як галіна рускага народа.

Для баўлення вольнага часу ў грамадскасці другой паловы XIX – пачатку XX ст. даволі папулярным з’яўляўся тэатр. Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. ні цэнтральныя, ні мясцовыя ўлады афіцыйна не забаранялі польскага тэатру ў беларускіх губернях. Але расійская адміністрацыя скарысталася разгромам мясцовай польскай эліты і ўсталявала курс на тэатр, як сродак русіфікацыі краю ў тым ліку з польскімі акцёрамі, але рускім рэпертуарам [29, s. 63].

Новы сезон у віленскім тэатры распачаўся зімой 1864 г. А ў студзені 1865 г. дырэктарам і рэжысёрам стаў акцёр Санкт-Пецярбургскага Александрынскага тэатру П. Васільеў. У абноўленым віленскім тэатры выступалі па-руску, часам па-французску. Рэпертуар быў як рускі (творы А.М. Астроўскага, “Ревизор” М.В. Гогаля), так і заходнееўрапейскі (драмы В. Шэкспіра і Ф. Шылера) [29, s. 63–64].

Вышэйшыя кіраўнікі мясцовай адміністрацыі надавалі значную ўвагу стварэнню гарадскіх тэатраў. Разам з тым, як прыватныя, так і губернатарскія ініцыятывы сутыкаліся з адной значнай праблемай – адсутнасцю фінансавых сродкаў. Таму для “ўмацавання рускага тэатра ў Заходнім краі” прызначаліся дзяржаўныя субсідыі [33, s. 384].

У сакавіку 1865 г. антрэпрэнёр правінцыйных тэатраў, дваранін А.А. Волгін падаў запіску на імя віленскага, ковенскага, гродзенскага і мінскага генерал-губернатара і галоўнага начальніка Віцебскай і Магілёўскай губерні. У ёй выказвалася жаданне заснаваць у Магілёве рускі тэатр, з дапамогай ад казны. 22 сакавіка 1865 г. памочнік генерал-губернатара, А.Л. Патапаў, пераслаў запіску з хадайніцтвам магілёўскаму губернатару і прасіў даць сваё заключэнне [34, арк. 6–7]. 26 сакавіка 1866 г. начальнік Магілёўскай губерні, А.П. Беклемішаў, паведаміў віленскаму генерал-губернатару аб спачуванні ў гэтай справе мясцовых жыхароў усіх саслоўяў. “Адкрыццё пастаяннага рускага тэатра ў г. Магілёве ў відах развіцця тут рускай народнасці, на маю думку вельмі важна”, – адзначаў губернатар. Аднак ён звяртаў увагу, што прапанова памочніка генерал-губернатара А.Л. Патапава “засталася без наступстваў па адсутнасці ў той час у Магілёве якой-небудзь трупы акцёраў, на выклік якой спатрэбіліся б больш значныя выдаткі чым цяпер”. Таму губернатар першапачаткова прапаноўваў заснаваць у горадзе тэатральную дырэкцыю [34, арк. 1–2, 6–6 зв.]. Віленскі генерал-губернатар К.П. фон Каўфман (1865 – 1866) 24 красавіка 1866 г. падтрымаў ідэю заснавання тэатра. Ён паведамляў: “я цалкам падзяляю Ваша меркаванне адносна карысці, якая прыносіцца тэатрам грамадству. Але … я прашу Вас прапанаваць магілёўскаму грамадству,

прыняць удзел у выдатках, якія непазбежна ўзнікнуць з паляпшэннем магілёўскай сцэны". Пры гэтым ён патлумачыў, што з-за больш значных расходаў па Беларуска-Літоўскаму краю, не можа прызначыць фінансаванне ад урада [34, арк. 9–9 зв.]. Адначасова генерал-губернатар выказаў А.П. Беклемішаву сваё меркаванне: "эпітэт "рускі", які надаецца магілёўскаму тэатру, я лічу цалкам залішнім і пазбаўленым усякага значэння, паколькі ў даручанай Вам губерні, якая мае рускае насельніцтва, акрамя рускага, іншага тэатра быць не можа" [34, арк. 9–9 зв.].

Такім чынам, К. П. фон Каўфман пераконваў, што ў Магілёўскай губерні жывуць рускія. У сваю чаргу словы і дзеянні А.П. Беклемішава сведчылі пра тое, што ён так не лічыў.

Віцебскія ўлады таксама дбалі пра развіццё мясцовага тэатральнага жыцця.

У 1873 – 1875 гг. у Віцебску для новага гарадскога тэатра перабудавалі будынак паліцэйскай часткі [35, с. 69–70]. Гэтую ініцыятыву гарадской супольнасці падтрымаў губернатар П.Я. Растоўцаў. Яшчэ ў 1870 г. ён звяртаўся да міністра ўнутраных спраў з просьбай аказаць дапамогу ў адкрыцці прыстойнага рускага тэатра. Ён жа хадайнічаў перад міністрам аб зацвярджэнні статута Віцебскага музычнага таварыства [1, с. 184–185]. Дзякуючы асабістым намаганням П.Я. Растоўцава па пераўладкаванні будынка для тэатра, віцебская гарадская супольнасць хадайнічала аб наданні гарадскому тэатру імя губернатара. 10 студзеня 1874 г. імператарскім указам, па прадстаўленні міністра ўнутраных спраў, віцебскаму гарадскому тэатру было нададзена імя П.Я. Растоўцава [35, с. 70].

У Мінску пра развіццё тэатральнага жыцця клапаціўся губернатар П. Н. Шалгуноў (1864 – 1868). У сувязі з забаронай польскамоўнай гульні на сцэне тэатра, у 1863 г. польская трупа раз'ехалася. Быў прызначаны новы дырэктар тэатра, які заснаваў таварыства рускіх драматычных артыстаў, што пачало даваць у Мінску тэатральныя прадстаўленні толькі на рускай мове [36, с. 85; 5, с. 211].

У 1888 г. пачалі будаваць пастаянны мінскі гарадскі тэатр (зараз – будынак Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы), які адкрылі ў 1890 г. Мінская гарадская дума вырашыла пабудаваць тэатр пад уплывам губернатара М.М. Трубяцкога (1886 – 1902), які дапамог ёй з субсідыяй ад казны [36, с. 87–90; 5, с. 260–262]. Мінскі губернатар адносна тэатра прытрымліваўся наступнага погляду: "…пры добрай пастаноўцы ён можа служыць такой жа школай, такой жа прыладай маральнага выхавання, як і навучальная ўстанова…" [36, с. 87–88]. З аднаго боку такая ўстанова магла падтрымліваць маральнасць наведвальнікаў, з другога – служыла б абрусенню жыхароў губерні і горада.

У Гродна гарадскі тэатр таксама меў падтрымку з боку губернатара. 14 снежня 1902 г. артысты і працоўныя гродзенскага тэатра скардзіліся начальніку губерні, П.А. Сталыпіну, на свайго антрэпрэнёра Мілера, які зацягваў з выплатай заробкаў. Губернатар даручыў разабрацца ў гэтай справе камісіі ў складзе князя А. Абаленскага і тэатральнага дырэктара А. Цвяткова. Яны прызналі, што скаржнікі маюць рацыю і пастанавілі выдаць ім грошы ў памеры 516 руб. з субсідыі, прызначанай міністрам унутарных спраў для гродзенскага тэатра. Як адзначае польскі гісторык Р. Юркоўскі, субсідыя, прызначаная для развіцця тэатра, выкарыстоўвалася для таго, каб пакрыць даўгі несумленнага антрэпрэнёра [33, s. 384].

***Навука.*** З мэтай абгрунтавання поглядаў на Беларусь, як спрадвечную частку Расіі быў створаны Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства. Нягледзячы на сваю афіцыйную мэту, установа паспрыяла этнаграфічнаму даследаванню края і стварыла асновы беларусазнаўства [13, с. 279; 37, с. 59].

Значны ўплыў на развіццё беларусазнаўства аказала дзейнасць статыстычных камітэтаў [38, с. 137], у якіх, як адзначалася, старшынствавалі начальнікі губерняў.

У канцы XIX – пачатку XX стст. ствараліся навуковыя таварыствы, а ўжо існуючыя актывізавалі сваю дзейнасць. Гэтыя арганізацыі існавалі ў розных галінах: медыцыне, педагогіцы, сельскай гаспадарцы. У 1912 г. мясцовая інтэлігенцыя арганізавала Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. Навуковыя таварыствы садзейнічалі распаўсюджванню сярод спецыялістаў і шырокіх колаў насельніцтва навуковых ведаў і перадавых ідэй [13, с. 418–420].

Губернатары садзейнічалі навуковаму вывучэнню падначаленых тэрыторый. Але даследаванні павінны былі даказваць гістарычную ці этнаграфічную тоеснасць беларусаў і рускіх. Матэрыялы, якія яўна супярэчылі гэтаму тэзізу не маглі трапіць у легальны расійскі друк.

Так, у 1876 г. па ўказанні мінскага губернатара В.І. Чарыкава (1875 – 1879) статыстычны камітэт выдаў капітальную працу "Список землевладельцев Минской губернии" [39, с. 71; 40].

Вырашэнне фінансавых пытанняў звязаных з даследаваннем беларускіх зямель таксама залежыла ад начальнікаў губерняў.

Архіварыўс Цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерняў А.М. Сазонаў у рапарце віцебскаму губернатару В.М. Далгарукаву ад 23 красавіка 1885 г. дакладваў, што на выданне XV выпуску Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў на 1884 г. было асігнавана 2000 руб. З гэтага крэдыту было выдаткавана 1161 руб. 90 кап. Таму А.М. Сазонаў прасіў губернатара адпусціць яму з крэдыту 1884 г. астатнія 838 руб. 10 кап. на пакрыццё чарговых расходаў па выданні XV выпуску Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў. В.М. Далгарукаў напісаў на дакуменце – "выканаць". З Віцебскага губернскага

казначэйства 28 красавіка 1885 г. на імя А.М. Сазонава быў выпісаны талон да авансавай асігноўкі на суму 838 руб. 50 кап. [41, арк. 61–61 зв., 63].

Вывучэнне Магілёўскай губерні ў геаграфічным, сацыяльна-эканамічным, гістарычным і іншых накірунках актывізавалася пры губернатары А.С. Дамбавецкім. У выніку гэтая праца ўвасобілася ў трохтомным выданні "Опыт описания Могилевской губернии", рэдактарам якога быў губернатар [12]. Магілёўскія гісторыкі і археолагі атрымалі яго падтрымку ў публікаванні сваіх даследаванняў. А.С. Дамбавецкі прапагандаваў перадачу археалагічных знаходак у губернскі музей, дзякуючы чаму экспазіцыі ўстановы значна папоўніліся і экспанаваліся ў Вільні і Маскве [25, 124]. Прынамсі, губернатар не столькі сам займаўся справамі ў галіне навукі і культуры, колькі прасоўваў адказных і кампетэнтных асоб, якія прыносілі поспех і плён.

Магілёўскі губернатар М.А. Зіноўеў (1893 – 1901) таксама садзейнічаў навуковаму даследаванню губерні, спрыяў выданню "Могилевской старины" – зборніка матэрыялаў па гісторыі, археалогіі, этнаграфіі Магілёўскай губерні пад рэдакцыяй Е.Р. Раманава [2, с. 218].

У Гродзенскай губерні мясцовая адміністрацыя таксама прыкладала намаганні па вывучэнні тэрыторыі і насельніцтва. З боку губернатара П.А. Сталыпіна неафіцыйная частка "Гродненских губернских ведомостей" атрымала фінансавую падтрымку. 11 лютага 1903 г. ён загадаў губернскаму праўленню выдаць рэдактару неафіцыйнай часткі ведамасцяў 3000 рублёў з сумы губернскага Камітэта апекі аб народнай цвярозасці. Грошы прадпісвалася накіраваць на развіццё гэтага раздзела газеты. Датацыя апраўдала сябе. Неафіцыйная частка ведамасцяў павялічылася ў аб'ёме і палепшала ў якасці. Перыядычна на старонках друку з'яўляліся гістарычныя артыкулы, карэспандэнцыя з губерні. Матэрыялы прысвячаліся ў тым ліку беларусам, якіх разглядалі як рускіх [33, s. 384–386].

У пачатку ХХ ст. старажытная Каложская царква на Гродзеншчыне патрабавала рамонту. У сувязі з чым для яе выратавання свае намаганні прыкладалі не толькі спецыялісты, але і гродзенскі губернатар М.М. Асаргін (1903 – 1905). Ён згадваў ва ўспамінах, што аднаўленнем і падтрыманнем гэтага старажытнага помніка ў краі займалася Імператарскае археалагічнае таварыства. Таму яму, як губернатару, прыйшлося прыняць актыўны ўдзел у гэтых працах. "Але сродкаў было мала, – пісаў М.М. Асаргін, – рэстаўрацыя ішла чарапашым крокам, і з'ехаў я з Гродна, пакінуўшы гэты храм увесь у падпорках і ўсё з той жа драўлянай сцяной" [42, с. 610].

Безумоўна, былі начальнікі, якія асабліва не думалі пра развіццё даручанай ім губерні: яны глядзелі на сваю пасаду больш, як на крыніцу ўласнага дабрабыту. Напрыклад, чыноўнік У.М. Токараў у 1876 г. быў прыцягнуты да суда за злоўжыванні падчас знаходжання на пасадзе мінскага губернатара [5, с. 229–230; 4, с. 246].

**Заключэнне.** Такім чынам, у службовыя абавязкі начальнікаў беларускіх губерняў уваходзіла праводзенне на месцах урадавай палітыкі. У той жа час, яны нярэдка выступалі з уласнымі прапановамі. Сваёй зацікаўленасцю і адміністрацыйнай уладай губернатары садзейнічалі культурнаму развіццю падначаленых тэрыторый. Між тым, губернатарскія ініцыятывы нярэдка замаруджваліся ці адмаўляліся з боку вышэйшага начальства па фінансавых ці палітычных прычынах. Губернатары аказвалі падтрымку пашырэнню дзяржаўнай (расійскай) пачатковай і сярэдняй адукацыі, але разглядалі яе не столькі як распаўсюджванне ведаў сярод мясцовага насельніцтва, колькі як фарміраванне вернападданніцкага і рэлігійнага (праваслаўнага) светапогляду. Стварэнне сеткі адукацыйных устаноў, тэатраў і вывучэнне Беларусі ў прарасійскім і праманархічным накірунку ажыццяўлялася пры актыўнай падтрымцы з цэнтра і губернатарамі на месцах. Пры гэтым адрозненні шматэтнічнага і шматрэлігійнага мясцовага насельніцтва, павінны былі сцірацца на карысць рускай мовы і культуры. Таму ўсе дасягненні былі арыентаваны на патрэбы Расійскай імперыі і рэдка ўлічвалі гістарычныя традыцыі, этна-лінгвістычныя асаблівасці краю і інтарэсы беларускага насельніцтва.

## ЛІТАРАТУРА


1. Вернер, И. Л. На губернаторском посту (о деятельности Павла Яковлевича Ростовцева по управлению Витебской губернией в 1869–1880 гг.) / И. Л. Вернер // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. / рэдкал.: Ю. М. Бохан [і інш.]. – Мінск : НГАБ, 2007. – Вып. 5. – С. 175–187.
2. Шимукенус, М. В. Могилевские губернаторы 1772–1917 гг. / М. В. Шимукенус // Архиварыус: зб. навук. паведамл. і арт. / рэдкал.: Ю.М. Бохан [і інш.]. – Мінск : НГАБ, 2008. – Вып. 6. – С. 212–221.
3. Афанасьева, Т. Ю. Гродненские губернаторы (1801–1917 гг.): документально-биографические очерки / Т. Ю. Афанасьева, Р. Ф. Горячева, В. В. Швед. – Гродно : Гродненская тип., 2007. – 166, [1] с.
4. Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства (1793–1917): биографический справочник / сост. Ю. Н. Снапковский ; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : Беларусь, 2016. – 398, [2] с.

5. Бригадин, П. И. Минские губернаторы: история власти / П. И. Бригадин, А. М. Лукашевич. – Минск : ГИУСТ БГУ, 2009. – 351 с.
6. Свод законов Российской империи: изд. 1857 г.: в 16 т. – СПб., 1857. – Т. 2, ч. 1 : Общее губернское учреждение. – 1474 с.
7. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772 – 1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 572, [1] с.
8. Общий наказ гражданским губернаторам: именной указ Сенату, 3 июня 1837 г., № 10303 // Полное собрание законов Российской империи. Собр. 2 : в 55 т. – СПб., 1838. – Т. 12: Отд. 1. – С. 361–439.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна (НГАБ у Гродна). – Ф. 1. Воп. 6. Спр. 463.
10. Снапкоўская, С. В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск : НІА, 1998. – 191 с.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 981.
12. Опыт описания Могилёвской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях, с двумя картами губернии и 17 резанными на дереве гравюрами видов и типов: в 3 кн. / сост. по программе и под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилев на Днепре : Тип. губерн. правления, 1882–1884. – Кн. 2. – 1884. – [6], 1000, [2] с.
13. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Соврем. шк.: Экоперспектива, 2007–2011. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX стст.) / М. Біч [і інш.]. – 2007. – 519 с.
14. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1874 год. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина. – 1874. – XVIII, 681 с.
15. Ляхоўскі, У. В. Школьная адукацыя ў Беларусі падчас нямецкай акупацыі (1915–1918 г.) / У. В. Ляхоўскі. – Вільня [Вільнюс] : Ін-т беларусістыкі; Беласток, Бел. гіст. тав-ва, 2010. – 340 с.
16. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1895–1896 учебный год, [ч. 1]. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина. – 1896. – VI, 163 с.
17. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. / М. М. Абраменка [і інш.]; рэдкал.: М. А. Лазарук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Нар. асвета, 1985. – 462, [1] с.
18. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8306.
19. Однодневная перепись начальных школ в Империи, произведенная 18 января 1911 года / Министерство народного просвещения. Вып. 8 (10): Виленский учебный округ. Губернии: Виленская, Витебская, Гродненская, Ковенская, Минская и Могилевская: [в 2 ч.]. – Тип. Тов-ва «Екатерингофское печатное дело», 1914. – [2], 26, 133, [1] с.
20. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 38614.
21. Моторова, Н. С. Деятельность органов городского самоуправления на территории Беларуси в социальной сфере (1875–1914 гг.) : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Н. С. Моторова. – Минск, 2010. – 156 л.
22. Свод высочайших отметок по всеподданнейшим отчетам генерал-губернаторов, губернаторов, военных губернаторов и градоначальников за 1893 год. – СПб. : Гос. тип., 1895. – XXXIX, 117 с.
23. Самусік, А. Магілёўскае рэальнае вучылішча / А. Самусік // Энцыкл. гіст. Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 15.
24. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1187.
25. Сидоренко, Б. И. Могилевский губернатор Александр Станиславович Дембовецкий и его время / Б. И. Сидоренко. – Могилев : АмелияПринт, 2012. – 250 с.
26. Миронов, Б. Н. Российская империя: от традиции к модерну : в 3 т. / Б. Н. Миронов. – СПб. : Дмитрий Буланин, 2014. – Т. 1. – 896 с.
27. Майков, П. М. Панютин, Степан Феодорович / П. М. Майков // Русский биографический словарь : в 25 т. – СПб. – М., 1896–1918. – Т. 13: Павел, преподобный – Петр (Илейка). – 1902. – С. 293–296.
28. Навукова-даведачная бібліятэка Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва. – Папка 87673. Всеподданнейший отчет виленскаго губернатора за 1885 г. – 14 арк.
29. Romanowski, A. Pozytywizm na Litwie: polskie życie kulturalne na ziemlach litewsko-białorusko-inflanckich w latach 1864–1904 / A. Romanowski. – Kraków : Universitas, 2003. – 485, [92] s.
30. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Ф. 1284. Воп. 223. 1884 г. Спр. 38.
31. Свод высочайших отметок по всеподданнейшим отчетам генерал-губернаторов, губернаторов, начальников областей и градоначальников за 1881–1890 гг. – СПб.: Гос. тип., 1893. – [2], IV, VIII, 522 с.
32. РДГА. – Ф. 1284. Воп. 194. 1902 г. Спр. 62.
33. Jurkowski, R. Kowieński marszałek, grodzieński gubernator: kresowe początki kariery politycznej Piotra Stołypina (1889–1903) / R. Jurkowski. – Olsztyn : Wydawnictwo UWM, 2015. – 615, [1] s.
34. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 976..

35. Кучеренко, В. Н. Культура Витебска конца XIX – начала XX в.: Витебский городской Ростовцевский театр (1873–1917 гг.) / В. Н. Кучеренко // Искусство и культура. – 2012. – № 1 (5). – С. 68–74.
36. Памятная книжка Минской губернии на 1891 год. – Минск : Типо-лит. Б. Н. Соломонова, 1890. – XLVI, 240, 128 с.
37. Беларусы : у 8 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 1995–2012. – Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння / В. К. Бандарчык. – 1999. – 365 с.
38. Корсак, О. В. Статистические комитеты белорусских губерний: создание, структура, деятельность (1835–1917 гг.) : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / О. В. Корсак. – Минск, 2017. – 217 л.
39. Памятная книжка Минской губернии 1878 года. – Минск : Тип. губерн. правл., 1878. – Ч. 2. – 122, 114 с.
40. Список землевладельцев Минской губернии за 1876 год. – Минск : Минск. губерн. стат. ком., 1877. – [2], XXIII, 185, [2] с.
41. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 53047.
42. Осоргин, М. М. Воспоминания, или Что я слышал, что я видел и что я делал в течение всей моей жизни, 1861–1920 / М. М. Осоргин. – М. : Росс. Фонд Культуры [и др.], 2009. – 999 с.

*Паступіў 16.02.2019*

## THE ACTIVITIES OF THE GOVERNORS IN THE DEVELOPMENT OF EDUCATION AND CULTURE OF BELARUSIAN PROVINCES IN 1864–1914

***Y. LIAPESHKIN***

*The article shows the activity of Governors of Vilna, Grodno, Minsk, Vitebsk and Mogilev provinces in the field of education, theater and research during 1864–1914. Present estimates, proposals, correspondence of governors on relevant issues and the results of these actions. Reflected motives and achievements of activity: positive and negative sides. It is noted that the heads of the provinces, not only implemented the disposal of senior management, but also they made decisions that influenced the cultural development of the province. However governor initiatives often slowed down or even rejected by superiors for financial or other reasons. Governors helped raise the cultural and educational level of the population of Belarusian provinces, but without regard to its ethno-linguistic features – in the framework of the policy of Russification..*

***Keywords:*** *Belarusian provinces, governors, education, cultural development, theater, science, Russification.*